ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 1 (999) ● ЧАЦВЕР, 4 студзеня 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

## ГОД ВЫДАННЯ— 38-ы

Многія ва універсітэце помняць, што студэнцкая шматтыражка выходзіла яшчэ ў даваенныя гады. Але калі быў выпушчан першы нумар, колькі нумароў налічвала даваеннае выданне газеты, дакладна не было ўстаноўлена. І вось нядаўна гэтыя звесткі ўдакладнены кафедрай гісторыі БССР нашага універсітэта. Як паведаміў загадчык кафедры прафесар Л. С. Абецэдарскі, першы нумар універсітэцкай шматтыражнай газеты выйшаў 1 мая 1935 года. Газета выдавалася аж да 12 чэрвеня 1941 года. За гэты перыяд выпушчана 127 нумароў.

Зыходзячы з гэтых даных, сёння мы ўносім змяненне ў выхадныя даныя нашай газеты: год выдання 38-ы, парадкавы нумар з часу заснавання — 999-ы.

**РЭДКАЛЕГІЯ.**



## ЗАЛАТАЯ СТАРОНКА У НАШЫМ ЛЕТАПІСЕ



ПЯРЭДАДЗЕНЬ navaгоддзя адзначан ва універсітэцкім калектыве вялікім святам. На ўрачыстае пасяджэнне, прысвечанае слаўнаму юбілею нашай краіны, сабраліся ў актавай зале і заслужаныя ветэраны і юнае студэнцкае пакаленне. З дакладам, насычаным красамоўнымі лічбамі і фактамі з працоўнай біяграфіі нашага многанацыянальнага народа, нашай роднай рэспублікі, выступіў удзельнік юбілейнага ўрачыстага пасяджэння ў Крамлі другі сакратар Цэнтральнага Камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Аляксандр Нічыпаравіч Аксёнаў. Ен расказаў аб тым глыбокім уражанні, якое зрабіў даклад Леаніда Ільіча Брэжнева, аб атмасферы брацтва і патрыятычнага ўздыму ў час юбілейных урачыстасцей. Адзначыўшы поспехі універсітэцкага калектыву ў сацыялістычным спаборніцтве ў гонар 50-годдзя ўтварэння Саюза ССР, А. Н. Аксёнаў горача павіншаваў выкладчыкаў, супрацоўнікаў і студэнтаў з высокай узнагародай і ўручыў рэктару БДУ прафесару У. М. Сікорскаму Юбілейную ганаровую грамату ЦК КП Беларусі, Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР, Савета Міністраў БССР і Белсаўпрофа.

Са словамі глыбокай, сардэчнай падзякі за паўсядзённую ўвагу і клопаты Камуністычнай партыі і ўрада рэспублікі аб універсітэце, за высокую ацэнку працы ўсяго калектыву выступіў рэктар БДУ У. М. Сікорскі.

Аб творчай, натхнёнай працы ў час падрыхтоўкі к вялікаму юбілею, аб шырокіх магчымасцях, адкрытых кожнаму савецкаму чалавеку, займацца навукай, далучацца да багаццяў нацыянальнай культуры, мастацтва, літаратуры братніх народаў гаварыў прафесар І. Р. Цішчанка.



Будучы філолаг Валянціна Красікава сардэчна, з маладым запалам выказала пачуцці студэнтаў, якім пашанцавала жыць і вучыцца ў шчаслівы час, у вялікай, дружнай сям'і народаў нашага цудоўнага Саюза.

Ад імя замежных студэнтаў, якія навучаюцца ў БДУ, сардэчна павіншаваў калектыў універсітэта з 50-годдзем утварэння СССР і высокай узнагародай аспірант Куан Мінь. Ён выказаў вялікую падзяку за салідарнасць з гераічнай барацьбой в'етнамскага народа, за дабрату і сардэчнасць, дапамогу ў вучобе і клопат аб замежных студэнтах.

З вялікім уздымам удзельнікі ўрачыстага пасяджэння прынялі прапанову паслаць прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР і Савету Міністраў СССР.

Прафесар М. Я. Шкляр зачытвае тэкст пісьма, і ўсе ў зале бурнымі апладысментамі сцвярджаюць свой намер працаваць яшчэ лепш, парадаваць Радзіму новымі поспехамі ў камуністычным будаўніцтве.

**А. АЛЕНІЧ.**

*НА ЗДЫМКАХ: уручэнне Юбілейнай ганаровай граматы; у зале ўрачыстага пасяджэння.*

*Фота М. Нечыпарэнкі і Д. Прэса.*

## У РЭКТАРАЦЕ

На адным з чарговых пасяджэнняў рэктарат заслухаў інфармацыю старшыні таварыства «Ахова прыроды» загадчыка кафедры заалогіі пазванковых У. К. Лапаціна аб рабоце пярвічных арганізацый таварыства на біялагічным, геаграфічным і юрыдычным факультэтах. Як адзначана ў пастанове, пярвічныя арганізацыі гэтых факультэтаў правялі пэўную работу па прапагандзе аховы, рацыянальнага выкарыстання прыродных багаццяў. Разам з тым звернута ўвага на тое, што на радзе факультэтаў (гістарычным, філалагічным, матэматычным, хімічным, прыкладной матэматыкі, спецыяльным факультэце прыкладной матэматыкі, журналістыкі) не створаны пярвічныя арганізацыі таварыства «Ахова прыроды», арганізацыйна не аформлен універсітэцкі савет аховы прыроды.

Рэктарат пастанавіў: стварэнне пярвічных арганізацый таварыства завяршыць да 15 лютага 1973 года; для кіраўніцтва пярвічнымі арганізацыямі стварыць савет па ахове прыроды; распрацаваць планы і арганізаваць работу гэтых органаў.

## СЯБРАМ — ДАБРАТА

Доўга не сыходзіла з вуснаў мільёнаў людзей, з газетных палос усяго свету слова Бангладэш.

Бангладэш — гэта і новая незалежная дзяржава, і новая канстытуцыя, і свабодны бенгальскі народ. І вось першыя яго пасланцы ў Савецкім Саюзе. Яны прыехалі сюда вучыцца.

Мне давялося сустрэцца з пасланцамі з Бангладэш, студэнтамі падрыхтоўчага факультэта.

— Я прыехаў у СССР у 1972 годзе, — расказвае Сабер Ахмед, — нарадзіўся і жыў у горадзе Дака. Закончыў школу, каледж, у 1971 годзе паступіў ва універсітэт інжынераў. Але вучыцца давялося там нядоўга, усяго 6 месяцаў, — пачалася вайна. Я з бацькамі пераехаў у вёску. Там, як мог, дапамагаў партызанам. Пасля перамогі зноў стаў вучыцца ва універсітэце, а летам мяне накіравалі ў Савецкі Саюз.

Я ўжо паўгода жыву ў Мінску, далёка ад Радзімы, але адчуваю сябе тут, як дома. У мяне з'явілася шмат сяброў— гэта савецкія і іншаземныя студэнты, з якімі я жыву, хаджу ў бібліятэку, на вечары і канцэрты. Мне вельмі падабаецца руская мова, таму я вучу яе з інтарэсам. Нам ужо чытаюць лекцыі па фізіцы, матэматыцы таксама на рускай мове.

— ШТО ЦІКАВАГА ПАСПЕЛІ ВЫ УБАЧЫЦЬ У БЕЛАРУСІ?

— Самае цікавае — гэта свята Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі. Мы многа чулі аб гэтым свяце ў сябе дома, і вось нам выпала магчымасць сустракаць яго разам з усім савецкім народам, разам сустракалі і 50-годдзе ўтварэння СССР.

Вельмі цікавая была паездка ў калгас.

У вольны час мы ходзім у тэатры, кіно, у цырк, удзельнічаем у факультэцкім інтэрнацыянальным хоры. Нас часта запрашаюць выступіць перад савецкімі людзьмі.

Мне вельмі падабаецца Беларусь, і працягваць вучобу я б хацеў у Мінску.

— А ЯКОЕ САМАЕ ЯРКАЕ ЎРАЖАННЕ АД ЗНАХОДЖАННЯ Ў НАШАЙ КРАІНЕ?

— Мяне ўразіла, як устойліва і ўпэўнена цячэ жыццё савецкага народа.

Гэтае ж пытанне я задала яшчэ некальным бенгальскім студэнтам.

— Самае вялікае маё ўражанне аб савецкіх людзях — іх дабрата, — адказаў мне Хабіб Рахман.

— Самае вялікае наша ўражанне аб савецкіх людзях — іх сардэчнасць і гасціннасць, — гавораць Ашраф Ахмед і Мухамед Лікат Алі. Нас запрашалі ў сем'і, знаёмілі з савецкай рэчаіснасцю і прымалі ў сябе дома як самых дарагіх гасцей.

Так, Савецкі Саюз заўсёды гатовы працягнуць руку дапамогі і дружбы.

**І. МАЗУРКЕВІЧ.**

## ПРАГРАМЫ СТАНУЦЬ ЛЕПШЫМІ

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя прад'яўляе ўсё больш высокія патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў па фізіка-матэматычных навуках. Ва ўмовах нарастаючай інфармацыі надзвычай востра з'яўляецца неабходнасць у такіх формах і метадах навучання, якія дапамаглі б будучаму спецыялісту не толькі (і, можа быць, і не столькі) дасягнуць належнага ўзроўню эрудзіраванасці, але і выпрацаваць у сабе здольнасць да «саманавучання». Таму невыпадкова ў апошняй пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР аб вышэйшай школе падкрэсліваецца асаблівая важнасць удасканалення праграм і вучэбных планаў.

Што на фізічным факультэце зроблена ў гэтым напрамку? Была створана метадычная камісія на чале з акадэмікам АН БССР М. А. Ельяшэвічам, якая пры шырокім удзеле ўсіх выкладчыкаў занялася пераглядам вучэбных праграм. У 1971-1972 навучальным годзе былі ў агульных рысах распрацаваны і ўзгоднены праграмы па ўсіх раздзелах курса агульнай фізікі: механіка; малекулярная фізіка; электрычнасць і магнетызм; оптыка; атамная фізіка; ядзерная фізіка. У гэтых новых праграмах атрымалі адлюстраванне не толькі навуковыя дасягненні апошніх год, але і прагрэсіўныя тэндэнцыі, якія намеціліся ў методыцы выкладання. У прыватнасці, новыя праграмы ўжо ўлічваюць вялікія змены, што адбыліся цяпер у выкладанні матэматыкі і фізікі ў сярэдняй школе.

У цяперашні час метадычная камісія ўшчыльную прыступае да перагляду ўсіх курсаў тэарэтычнай фізікі, а таксама спецыяльных курсаў. Самы актыўны ўдзел у гэтай важнейшай рабоце павінны прыняць грамадскія арганізацыі факультэта.

**В. ГРАКАЎ,**
вучоны сакратар метадычнай камісіі аддзялення фізікі.

## СВЯТА ДРУЖБЫ

У гэты вечар у прасторнай зале Ліскаўскага Палаца культуры Клецкага раёна гучалі рускія, беларускія, украінскія песні, чулася балгарская, румынская, нямецкая і іншыя мовы. У госці да хлебаробаў, жывёлаводаў, механізатараў ордэна Леніна племзавода «Чырвоная Зорка» і калгаса «Савецкая Беларусь» прыехалі студэнты Балгарыі, В'етнама, ГДР, Румыніі, Кубы, Самалі, Йемена, што вучацца ў нашым універсітэце. Днём юнакі і дзяўчаты агледзелі гаспадарку, сустракаліся з калгаснікамі і рабочымі, наведалі сваіх сяброў — школьнікаў.

А вечарам адбылося сапраўднае свята дружбы.

**І. СЦЯПУРА.**
(Карпункт прафкома).

# ЭКЗАМЕНУЕ СЕСІЯ



**Цяпер усё падпарадкавана ёй, экзаменацыйнай сесіі. Яна авалодала думкамі і часам, прымусіла працаваць з патроенай энергіяй. Яна ж выстаўляе адзнакі: добрыя — за добрасумленнасць, стараннасць, працавітасць.**

*НА ЗДЫМКАХ: залік па матэматычнаму аналізу ў другакурснікаў матфака прымае асістэнт кафедры матэматычнага аналізу М. А. Зотава.*

*Фота Д. Чаховіча.*



# АДКАЗНА І НЯЛЁГКА

Камсамольскае жыццё

— Вольга?.. Толькі што была ў 703-й аўдыторыі, у першакурснікаў,—бягу на сёмы паверх...

— Вольга?.. Напэўна, на другім курсе, там камсамольскі сход, — імчуся па прыступках уніз.

— Вольга?.. На пасяджэнні камітэта камсамола. — Ля 713-й аўдыторыі маё «падарожжа» нарэшце канчаецца.

Давайце разам зойдзем і паслухаем, якія пытанні вырашаюць члены камітэта, што іх хвалюе, аб чым яны спрачаюцца...

Л. Новікаў, адказны за ідэалагічную работу, інфармуе камітэт аб падрыхтоўцы да камсамольскіх сходаў. Яго ўважліва слухаюць таварышы, уносяць свае прапановы, дзелавыя, канкрэтныя.

— Абавязкова трэба прааналізаваць на сходзе работу, якая вялася камсамольцамі курса ці групы па дастойнай сустрэчы свята—50-годдзя ўтварэння СССР, каб кожны камсамолец змог выказаць свае думкі, унесці прапановы, каб сход закрануў за жывое... — гаворыць Вольга Нясюк, сакратар камітэта камсамола біяфака.

...Камсамольцы дыскуціруюць, няма ні аднаго раўнадушнага позірку, і гэта — галоўнае! Іх хвалюе ўсё: і правядзенне камсамольскіх сходаў, і шэфская работа.

Каб работа з вучнямі прыносіла значную карысць, камсамольцы вырашылі ўмацаваць сувязь з педагагічнымі калектывамі падшэфных школ, прапанаваць кіраўнікам, настаўнікам прысылаць у камітэт камсамола свае водзывы аб рабоце шэфаў-студэнтаў, пажаданні, прапановы. Адным словам, працаваць творча і з поўнай аддачай.

Апошняе пытанне — аб рабоце СНТ з першакурснікамі— выклікала, бадай, самыя гарачыя спрэчкі.

В. Касцюк, адказны за работу з першакурснікамі, прапанаваў правесці свайго роду эксперымент: арганізаваць навуковую лабараторыю для малодшых курсаў, дзе старэйшыя таварышы кіравалі б іх работай. Прапанова атрымала гарачую падтрымку членаў камітэта.

Пасяджэнне закончылася, а абмен думкамі працягваецца. Спрачаюцца на лесвіцы, каля выхаду, па дарозе...

І мне міжволі падумалася: «Адказна, напэўна, быць камсамольскім важаком».

Адказна і нялёгка.

**Т. СКІБІЦКАЯ.**

# ЗМЕНУ РЫХТУЮЦЬ СТУДЭНТЫ

ГЭТЫЯ лекцыі праходзяць ва універсітэцкіх аўдыторыях, толькі вось чытаюць іх не прафесары, а студэнты. Так, студэнты.

Пры камітэце камсамола ёсць вячэрнія падрыхтоўчыя курсы на грамадскіх асновах, а «прафесарска-выкладчыцкі састаў», у большасці, — студэнты. Аб рабоце гэтых курсаў і расказвае дэкан... студэнт IV курса аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта Уладзімір Лукашэвіч.

**— Колькі ж чалавек займаецца на курсах?**

— Бачыце, заяў з просьбай аб прыняцці на курсы шмат. Мы ж змаглі залічыць 908 чалавек. Усім, хто падае заявы пазней устаноўленага тэрміну, прыходзіцца адмаўляць.

**— А якім чынам праходзіць адбор слухачоў?**

— Фактычна, адбор праходзіць яшчэ на прадпрыемствах. Будучы слухач павінен прадставіць камсамольскую характарыстыку, а камітэты камсамола, вядома, да нас накіроўваюць лепшых.

— Адзін дзевятнаццацігадовы юнак неяк сказаў: «Жыць хачу, а не вецер малаціць». Хто і па якой прычыне гэта гаварыў—не важна. Ясна адно: ён хоча цяпер, у гэтую мінуту, шукаць, эксперыментаваць, рабіць свае адкрыцці, прыносіць людзям не якую-небудзь абстрактную, а канкрэтную карысць. Ці можна гэта сказаць аб студэнтах-выкладчыках?

— Так, канешне, і яны таксама імкнуцца знайсці штосьці новае, сваё. Хто здаваў экзамены, той ведае, што цяжэй за ўсё даецца замежная мова. Раней мы абмяжоўваліся толькі невялікай колькасцю заняткаў-кансультацый. У сёлетнім навучальным годзе замежную мову пачалі выкладаць сістэматычна. Каб павялічыць аб'ём практычных, замест паточнага метаду вядзення заняткаў амаль поўнасцю перайшлі на групавы. Для замацавання пройдзенага матэрыялу слухачы выконваюць работы на ўзроўні кантрольных заданняў завочна-вочных падрыхтоўчых курсаў.

**— Што, па-вашаму, з'яўляецца галоўным звяном у рабоце курсаў?**

— Тут можна ўспомніць лозунг: «Кадры вырашаюць усё!» Выкладчыкаў патрэбна шмат. Ёсць у нас ужо свае энтузіясты, якія працуюць не першы год. Гэта дацэнт кафедры фізічнай хіміі М. Г. Рафальскі, кандыдат навук, старшы выкладчык кафедры гісторыі СССР Ю. І. Драгун, аспірант кафедры біяхіміі і біяфізікі М. В. Шолух, аспірант кафедры мікрабіялогіі В. А. Паркулевіч, студэнты чацвёртага курса філалагічнага факультэта Валянціна Карневіч, Раіса Асташова, Ліна Каганава, Нэля Хурс, студэнты трэцяга курса матэматычнага факультэта Вера Гаўрыловіч, Алена Дзікавіцкая, Любоў Сідарэнка, Наталля Пятаева і многія іншыя.

**— І апошняе пытанне. Вашы планы на будучы вучэбны год? Ці будуць змяненні ў арганізацыйнай структуры?**

— Планы мы намячаем зыходзячы з той ацэнкі, якую дае нашай рабоце камітэт камсамола, улічваем прапановы выкладчыкаў, слухачоў, нарэшце, зыходзячы з асабістага вопыту і нявырашаных задач. Я ўжо адзначыў, што мы не змаглі прыняць на курсы ўсіх жадаючых, таму ў будучым навучальным годзе намячаем стварыць філіялы курсаў на буйнейшых прадпрыемствах Мінска. І, канешне, асноўнай на будучы год застанецца задача лепшай падрыхтоўкі слухачоў, хоць мы і цяпер дапамагаем ім набыць трывалыя веды. Каб не быць галаслоўным, прывяду такі прыклад: 30 працэнтаў слухачоў у мінулым годзе паступілі ва універсітэт на розныя факультэты. Гэта не ўлічваючы тых, хто паступіў у іншыя вну Мінска.

**С. ДЗЕЯНКОЎ,**
**студэнт.**

# ПАДКАЗВАЕ—ЖЫЦЦЁ, ПАДТРЫМЛІВАЮЦЬ—ТАВАРЫШЫ

Камсамольскае жыццё на курсе... Вядома, што ў многім яно залежыць ад саміх камсамольцаў, ад іх захаплення, запалу, зацікаўленасці. І ад кіруючага звяна. Калі камсамольскія актывісты будуць добрымі арганізатарамі цікавых спраў, яны заўсёды знойдуць падтрымку, і камсамольскае жыццё забурліць у поўную сілу.

Цікава, а што думаюць наконт гэтага першакурснікі? Падыходзіць к канцу першы вучэбны семестр, можна зрабіць нейкія вывады, прааналізаваць сваю работу, задумацца, а ці правільна яна арганізавана.

З такімі пытаннямі я звярнуўся да сакратара камсамольскага бюро патока першага курса хімічнага факультэта Сашы Прыся.

— Работа на патоку актывізавалася з першых дзён, пасля першага сходу. І калі аналізаваць работу камсамольскіх груп першакурснікаў, то смела можна сказаць, што лепшая з іх— трэцяя, дзе групкамсоргам Л. Гайчукова.

— А што цікавае адбылося за гэты час?

— Асабліва запомніўся ўрачысты сход, прысвечаны 50-годдзю ўтварэння СССР, на якім выступалі камсамольцы 20-х гадоў.

У Сашы свае хваляванні, цяжкасці, адна з якіх агульная для ўсіх першакурснікаў — мала яшчэ ведаюць адзін аднаго. Таму я і спытаў, што было зроблена, каб пераадолець гэты бар'ер?

— Дапамог праведзены паміж групамі «Агеньчык». Было весела. Іменна тут мы ў нечым знайшлі агульную мову, хтосьці параіў цікавае, хтосьці падтрымаў.

— Значыць, можна сказаць, што жыццё закіпела ў поўную сілу?

— Не, так сказаць яшчэ ўсё ж нельга.

Нельга таму, што нейкая пасіўнасць назіраецца з боку ўчарашніх школьнікаў. Здаецца, прыйшлі пасля школы, яшчэ не астылі ў памяці школьныя вечары і сходы, але тут рабят з цяжкасцю ўдаецца расварушыць. Лягчэй з тымі, хто ці пасля арміі, ці з падрыхтоўчых курсаў. Яны бяруцца за любую справу. Вельмі актыўна ўключыліся ў жыццё курса такія камсамольцы, як Г. Лахманчук, Г. Мількін і іншыя. З такімі камсамольцамі працаваць — адно задавальненне.

**А. ХІЛІМОН.**
**(Прэс-цэнтр камітэта камсамола).**

# У ДРУЖНАЙ СЯМ'І

Цесныя навуковыя сувязі падтрымлівае філалагічны факультэт з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі розных саюзных рэспублік і замежных краін. Адтуль прыязджаюць у Беларускі дзяржаўны універсітэт студэнты, прадстаўнікі навуковай моладзі, каб пашырыць свае веды ў галіне мовазнаўства і літаратуразнаўчых дысцыплін. Пройдзе колькі год, і часцінка нашай нацыянальнай культуры стане добра вядомай маладым спецыялістам з ПНР, ГДР, Балгарыі...

Можна зразумець хваляванне Ядзвігі Зянькевіч з ПНР. Як і ў многіх студэнтаў БДУ, гэта сесія — першы экзамен яе ведаў у нашай навучальнай установе.

Румяна Яўцімава скончыла Сафійскі універсітэт. На працягу трох гадоў стажыроўкі на філфаку думае падрыхтавацца да абароны дысертацыю. Прафесар А. Я. Супрун дапамагае Фрэду Мантаю з ГДР у дасягненні аналагічнай мэты.

Некалькі год назад у Армянскім дзяржаўным універсітэце была створана кафедра літаратурных сувязей. Бліжэйшае знаёмства з лепшымі здабыткамі нацыянальных культур розных рэспублік нашай краіны — адна з мэт яе стварэння. У гэтым напрамку і вядзе навуковую работу Лаліта Меліксецян. Вярнуўшыся дамоў, Лаліта зможа кваліфікавана знаёміць сваіх суайчыннікаў з цудоўнай літаратурай Беларусі.

І на іншых факультэтах займаецца моладзь розных нацыянальнасцей. Яна ўдзячна беларускаму народу за цёплы і сардэчны прыём, дапамогу ў працы.

**І. РОЎДА,**
**студэнт філфака.**



*Лабараторыя інфармацыйна-вымяральных сістэм кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ. Даследаванні праводзяць старшы інжынер Б. Ф. Маскалік і малодшы навуковы супрацоўнік А. Ф. Раманаў.*

*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*

# ПЕРАМОЖЦЫ КОНКУРСУ

Падведзены вынікі конкурсу паточных і кафедральных насценных газет, аб'яўленага камітэтам камсамола фізфака ў гонар 50-годдзя ўтварэння СССР.

Месцы размеркаваліся наступным чынам: І—«Шукальнік» (І курс радыёфізікаў), ІІ—«Саюз пяці» (ІІ курс 2-га патока), ІІІ — «Фізік» (ІІ курс 1-га патока); сярод кафедральных газет: І—«Імпульс» з дадаткам «Антысмехатрон» (кафедра ядзернай фізікі), ІІ—«Індыкатар» (кафедра ЭММ), ІІІ—«Тэрмапара» (кафедра цеплафізікі).

**Г. СВЯТЛОЎ.**



Апошнюю лекцыю па гісторыі сучаснай буржуазнай філасофіі для студэнтаў V курса аддзялення філасофіі чытае дацэнт М. В. РОЖЫН.

Фота Д. Чаховіча.



# РАЗУМЕННЕ

Калі наша універсітэцкая дружына выходзіла на дзяжурства, то ў штабе міліцыянер жартаваў: «Усе парушальнікі парадку вас збаяцца»,— і падміргваў Віктару Супрунчуку, нашаму камандзіру, валатоўскага складу хлопцу. Ці то спраўдзілася прадказанне лейтэнанта, але нашы дзяжурствы заканчваліся без асаблівых выпадкаў. У сіле ж свайго камандзіра мы пераканаліся потым.

Аднаго разу ў штаб прывялі падвыпіўшага юнака: спаў на лаўцы ў парку. Хлопец паводзіў сябе груба, не жадаў нічога слухаць і на пытанні адказваў рэзка. Спробы дружыннікаў распачаць з ім гаворку не мелі поспеху. Тады да яго падышоў Супрунчук.

— Вагоны, кажаш, разгружаў. Зарабіў і выпіў. Я таксама грузчыкам быў.

Мы слухалі, як Віктар загаварыў пра жыццё, працу, і заўважылі, што хлопец сцішыўся, пачаў расказваць пра цяжкае становішча ў сям'і, а потым запытаў: «А што мне рабіць?»

— Хочаш мець спецыяльнасць — вучыся, ідзі працуй, калектыў дапаможа, — была парада Супрунчука.

Не проста так гаварыў Віктар. Ён ведаў цану сваіх слоў, бо ведаў жыццё. Сапраўды, ён працаваў грузчыкам, скончыў вучылішча, стаў электратэхнікам. Не адну лінію электраперадач працягнуў па краіне, і не ў адно месца прынёс святло. Многаму навучыла маладога электрыка паходнае жыццё, многае пабачыў. Потым служыў у арміі, дзе камуністы прынялі яго ў свае рады. Так напліваліся жыццёвы вопыт, жыццёвая мудрасць, што не адразу даецца чалавеку.

...Заканчваўся першы год вучобы ва універсітэце. Наступала лета. Пасля кніжак, канспектаў хацелася зноў адчуць салёны смак поту, спякоту стэпавага сонца. Парторгам атрада «Аптыміст» будаўнічага факультэта БПІ паехаў Віктар у казахстанскія стэпы будаваць жылыя дамы і гаспадарчыя аб'екты. Любая праца была яму па плячу. Будучыя інжынеры-будаўнікі дзіву даваліся, як з аднолькавым уменнем Віктар клаў сцены, крыў дах, слаў падлогу.

— Табе наканавана будаўніком быць, а не журналістам, — сцвярджалі сябры.

Але пасля работы, калі стэп засцілала душная ноч, браўся Віктар за ручку. Перад вачыма ўсплывалі родная Беларусь, маленькая вёска на Брэстчыне, сінявокая рэчка і набрынялыя водарам кветак лугі, цяністы, задуменны бор. Ён жа пісаў пра стэп, які выгараў, але жыў. І «Знамя юности» атрымлівала ад свайго карэспандэнта звесткі пра справы атрада, расказы аб студэнтах-будаўніках, а потым з'явіўся ў друку дзённік аб працоўным семестры.

Аб леце засталіся ўспаміны. Зноў вучоба, факультэцкія будні. Супрунчука абралі старшынёй прафкома факультэта. Спраў прыбавілася. Рэдка выпадае вольная хвіліна.

— Цяжка,— згаджаецца Віктар,—аднак трэба паспяваць, гэтага патрабуе жыццё. Я так разумею.

А. САПЁРАЎ.

# ПУЦЁЎКУ ДАЛА АСПІРАНТУРА

*За прайшоўшыя 46 год аспірантуру ў нашым універсітэце закончыла больш 1200 чалавек, 800 выпускнікоў абаранілі кандыдацкія дысертацыі, а многія з іх сталі дактарамі навук, прафесарамі. Гэта вялікая армія вучоных, якая вядзе буйныя навуковыя даследаванні і педагагічную работу ў вну рэспублікі і навукова-даследчых цэнтрах. Сярод выхаванцаў акадэмікі, члены-карэспандэнты АН БССР і СССР, рэктары вну і кіраўнікі НДІ.*

*З году ў год расце колькасць падрыхтаваных у аспірантуры навуковых супрацоўнікаў. Так, калі ў пярэдваенную пяцігодку праз аспірантуру было падрыхтавана 39 кандыдатаў навук па 11 спецыяльнасцях, то ў 1971 годзе 87 яе выпускнікоў абаранілі кандыдацкія, а 18 чалавек—доктарскія дысертацыі. У асноўным гэта супрацоўнікі універсітэта.*

*У цяперашні час у аспірантуры універсітэта праходзіць падрыхтоўку трэць аспірантаў усіх вну рэспублікі, а іх агульная колькасць складае 375 чалавек. Падрыхтоўка вядзецца па 78 спецыяльнасцях, у тым ліку і па найбольш новых, такіх, як вылічальная тэхніка, эксперыментальная фізіка, тэарэтычная кібернетыка, электронная тэхніка і прыборы, антэнна-фідэрныя канструкцыі і іншых.*

*Навуковае кіраўніцтва аспірантамі здзяйсняе больш 100 дактароў навук і 90 кандыдатаў навук, дацэнтаў.*

*Значны ўклад у падрыхтоўку навуковых кадраў унеслі прафесары Ю. С. Багданаў, Г. Г. Вінберг, І. М. Лушчыцкі, М. Р. Ларчанка, М. М. Паўлючэнка, Р. Л. Старобінец, А. Н. Сеўчанка, В. І. Сцяпанаў, М. Я. Шкляр.*

**Сорак шэсць гадоў існуе аспірантура пры нашым універсітэце. Адным з першых яе выхаванцаў быў Мікалай Іванавіч Шапавалаў.**

**М. І. Шапавалаў нарадзіўся ў Барысаве ў сям'і рабочых. У 1923 годзе паступіў у Беларускі дзяржаўны універсітэт на факультэт грамадскіх навук, пасля паспяховага заканчэння якога быў пакінут у аспірантуры па спецыяльнасці «Філасофія» (1927 г.). Затым на працягу многіх год выкладаў марксісцка-ленінскую філасофію, знаходзіўся ў арміі на палітычнай рабоце. Ён кандыдат філасофскіх навук, дацэнт.**

**М. І. Шапавалаў — удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, палкоўнік у адстаўцы, кавалер 15 ўрадавых узнагарод. У цяперашні час жыве ў Маскве.**

**Спадзяемся, што ўспаміны Мікалая Іванавіча аб вучобе ў аспірантуры ў першыя гады яе існавання будуць цікавымі для сённяшняга пакалення студэнтаў.**

**Т. АДУЛА,**
**аспірант кафедры гісторыі філасофіі і логікі.**

# У ПАЧАТКУ ДАРОГІ

Нядаўна, пасля шматгадовай разлукі, мне давялося пабываць у горадзе свайго юнацтва — Мінску, які стаў буйным цэнтрам беларускай навукі і культуры. Гонар яго — Беларускі дзяржаўны універсітэт. Больш паўстагоддзя прайшло з той пары, калі універсітэт адкрыў свае дзверы. У дваццатыя гады ён воляй партыі здабываў новыя імпульсы для свайго развіцця. Вельмі важным звяном у гэтым працэсе было стварэнне аспірантуры па прыродазнаўчых і грамадскіх навуках. Перад многімі ўчарашнімі студэнтамі адкрываліся светлыя перспектывы набыцця шырокіх і грунтоўных ведаў, магчымасць з вузаўскіх кафедр несці святло навукі ў шырокія масы народа.

Першай прыступкай, дзе праходзілі пробу веды студэнтаў па гісторыі і філасофіі, былі семінарскія заняткі. Імі кіравалі відныя вучоныя —акадэмікі, прафесары У. І. Пічэта, С. Я. Вальфсон, У. М. Перцаў і іншыя. Многія работы, выкананыя студэнтамі ў гэтых семінарах, стаялі на ўзроўні сур'ёзных навуковых даследаванняў і публікаваліся ў друку. Сярод першых аспірантаў было нямала здольных людзей. Па гісторыі Беларусі прыкметна выдзяляліся даследчымі здольнасцямі Д. А. Дудкоў, К. І. Кернажыцкі, І. Ф. Лочмель і іншыя. Па філасофіі ў першы год адкрыцця аспірантуры быў прынят П. М. Кірушын. і ў 1927 годзе я і Ю. Н. Майзель, у наступныя гады Р. А. Левін, І. М. Ільюшын.

Кіраваў нашымі заняткамі С. Я. Вальфсон. Сямён Якаўлевіч быў сапраўдным вучоным-марксістам, чалавекам багатай культуры і вялікай асабістай абаяльнасці. Яго грамадска-навуковая і педагагічная дзейнасць была высока ацэнена ЦК КПБ і ўрадам Беларусі, неаднаразова адзначана ўзнагародамі. С. Я. Вальфсон кіраваў Інстытутам філасофіі Беларускай АН і актыўна ўдзельнічаў у дзейнасці многіх навуковых устаноў БССР і СССР.

Праграма вучэбных заняткаў з аспірантамі ў нас увогуле не адрознівалася ад праграм аналагічных устаноў, дзе вялася падрыхтоўка выкладчыцкіх кадраў (з папраўкай на нацыянальныя асаблівасці БССР).

Звычайна аспіранты наведвалі дзве-тры лекцыі ў годзе па праблемах беларускай навукі і культуры.

Працуючы па адзінай вучэбнай праграме і індывідуальнаму плану, мы з цікавасцю слухалі лекцыі прафесараў Б. Э. Быхоўскага і Р. М. Выдры, прысвечаныя крытыцы буржуазнай рэакцыйнай філасофіі і сацыялогіі. Класічныя філасофскія творы марксізму мы вывучалі самастойна пад кантролем навуковага кіраўніка, і па выніках гутаркі з ім ставіўся залік.

Сістэматычныя заняткі вяліся па нямецкай мове. Пры перакладах з нямецкай на рускую мы шырока карысталіся нямецкімі выданнямі класічных твораў марксізму.

Неяк на маю долю выпала нялёгкая праца перакладу другой главы твора Ф. Энгельса «Людвіг Фейербах і канец класічнай нямецкай філасофіі». Памятаецца, што гутарка з выкладчыкам нямецкай мовы па гэтаму перакладу мне прынесла нямала непрыемнасцей. Удасканаленню нашых ведаў па нямецкай мове садзейнічала патрабаванне, у межах магчымага, пры крытыцы буржуазных і рэвізіяніcцкіх канцэпцый, карыстацца арыгіналамі.

Абодва мы — я і Юрка (так па студэнцкай прывычцы многія звалі Ю. Майзеля)—былі перагружаны грамадскай і вучэбнай работай. Але часам мы дазвалялі сабе пазбавіцца ўсякіх спраў і заняцца шахматамі. Мой сябра быў вялікім знаўцам шахматнай гульні, нядрэнна ведаў тэорыю і адзін час нават з некаторым поспехам выступаў у рэспубліканскіх турнірах. Аднойчы ён гуляў адначасова са мной і Б. А. Лапатко на дзвюх дошках і, лежачы на канапе, з закрытымі вачыма дыктаваў хады. На стале ляжалі прынесеныя ім два тамы І. Канта «Крытыка чыстага розуму» і «Крытыка практычнага розуму». Мы жартавалі, што яго шахматысцкі дар Кант аднёс бы да галіны непазнавальнага.

Абодва мы Канта не любілі і больш ахвотна звярталіся да Гегеля. З вялікай цікавасцю перачытвалі і прадумвалі ленінскія выказванні аб дыялектыцы Гегеля ў артыкуле «Аб значэнні ваяўнічага матэрыялізму». І гэта зразумела, таму што з часу выхаду ў свет ленінскага філасофскага запавету нас аддзяляла ўсяго пяць год!

Непрыкметна надышоў 1930 год — год заканчэння вучобы. Нас выпускалі без абароны кандыдацкіх дысертацый, так як у той час яна не прадугледжвалася праграмай. Выкладчыцкую работу ў БДУ я пачаў годам раней, яшчэ да заканчэння аспірантуры. Тады ж быў назначан вучоным сакратаром Інстытута філасофіі Беларускай Акадэміі навук.

Аднак сямейныя абставіны прымусілі мяне пераехаць у Растоў-на-Доне. Здаваў я справы толькі што закончыўшаму аспірантуру, цяпер члену-карэспандэнту Акадэміі навук БССР І. М. Ільюшыну.

З горыччу пакідаў я родныя месцы. Думалася, часова. Але абставіны скλаліся інакш. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Я быў прызван у армію і застаўся на ваенна-палітычнай рабоце доўгія гады. Час шчодра пасерабрыў маю галаву і падвёў да парога сямідзесяцігоддзя, які я пераступіў у гэтым годзе.

М. ШАПАВАЛАЎ.

# ВЫЙШЛІ Ў ВЫДАВЕЦТВЕ БДУ




**Багаты на кніжную прадукцыю быў мінулы год для універсітэцкага выдавецтва. Сярод многіх кніг, брашур, манаграфій прыкметна выдзяляюцца выданні, прысвечаныя знамянальным датам, якія адзначаліся на працягу года. Да 90-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і Я. Коласа выйшаў зборнік артыкулаў выкладчыкаў і аспірантаў філалагічнага факультэта «Народныя песняры», а ў серыі «Беларускія публіцысты» — кніга І. К. Жыдовіча «Я. Купала— публіцыст».**

**50-годдзю ўтварэння СССР прысвечана кніга прафесара кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў М. Я. Шкляра «Беларуская ССР — адна з заснавальніц Саюза ССР». Праца ўяўляе сабой папулярны нарыс аб удзеле БССР у стварэнні шматнацыянальнай савецкай дзяржавы. У ёй прыведзены яскравыя факты і прыклады, якія сведчаць аб тым, як пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі мацнела непарушная дружба народаў нашай краіны — адна з многіх рухаючых сіл савецкага грамадства.**

**На гісторыкаў і шырокае кола чытачоў, якія цікавяцца мінулым беларускага народа, яго ўзаемаадносінамі з вялікім рускім народам, разлічан зборнік дакументаў «Руска-беларускія сувязі ў другой палове XVII ст.», падрыхтаваны кафедрай гісторыі БССР БДУ сумесна з Цэнтральным дзяржаўным архівам старажытных актаў.**

# У ДРУЖБЕ З ЛІТАРАТУРАЙ

*Апошні месяц 1972 года для універсітэцкіх аматараў кнігі быў насычан шматлікімі літаратурнымі канферэнцыямі, вечарамі, прысвечанымі 50-годдзю ўтварэння СССР.*

*Тэма Радзімы, дружбы заўсёды ў цэнтры ўвагі пісьменнікаў і паэтаў розных нацыянальнасцей нашай краіны, стала натхняючай крыніцай іх творчасці. Гэтай думкай было прасякнута кожнае выступленне студэнтаў і выкладчыкаў на агульнауніверсітэцкай канферэнцыі чытачоў пад назвай «Саюз непарушны рэспублік свабодных». Даклады і паведамленні на гэтай канферэнцыі суправаджаліся чытаннем твораў пісьменнікаў.*

*На геаграфічным факультэце, напрыклад, прайшла канферэнцыя на тэму «Вялікі Кастрычнік у нацыянальных літаратурах народаў СССР». Студэнты падзяліліся сваімі думкамі аб творчасці літаратараў брацкіх рэспублік — В. Лацiса, Ч. Айтматава і іншых.*

*Актыўны ўдзел у правядзенні літаратурных канферэнцый на факультэтах прынялі выкладчыкі філфака — дацэнты С. Х. Александровіч, С. А. Лысенка, У. С. Карабан, Н. Н. Рамашка і іншыя.*

***

*Нядаўна ў 4-й групе III курса хімфака быў праведзен традыцыйны вечар паэзіі. Студэнты з захапленнем расказалі аб сваіх любімых паэтах К. Сіманаве, Р. Гамзатаве, О. Бергольц, Л. Тацянічавай і Я. Еўтушэнку. Студэнты Аляшкевіч, Марсан, Бурчык, Казлоўская, Айрамава і іншыя прачыталі іх вершы і паэмы.*

*А. СЯРГЕЕЎ.*

***

*Нядаўна супрацоўнікі бібліятэкі юрыдычнага факультэта разам са студэнтамі I курса правялі канферэнцыю чытачоў — «Вобраз чэкіста ў савецкай літаратуры».*

*Удзельнікі канферэнцыі абмеркавалі кнігі «Шчыт і меч» В. Кажэўнікава, «Семнаццаць імгненняў вясны» Ю. Сямёнава, хранікальна-дакументальныя аповесці пра чэкістаў.*

*Цікавымі і змястоўнымі былі выступленні С. Нікіцінай, В. Кавальчука, С. Пракапенкі, С. Мачалава, М. Ляонава.*

*Канферэнцыі чытачоў, дыспуты па кнігах часта праводзяцца на факультэце. Студэнты любяць такія сустрэчы з кнігамі, заўсёды чакаюць іх. Цяпер яны рыхтуюцца да дыспуту па кнізе С. Сартакова «Філасофскі камень».*

*Г. ПЯСЕЦКАЯ.*



Заўсёды пакідаюць незабыўнае ўражанне сустрэчы з ветэранамі. Адна з такіх сустрэч адбылася на падрыхтоўчым факультэце.

Фота **М. Нечыпарэнкі.**

# НОВЫЯ КНІГІ ПА ФІЛАЛОГІІ

1. Аникст, А. А. Теория драмы в России от Пушкина до Чехова. М., «Наука», 1972.
2. Аполлодор. Мифологическая библиотека. (Перевод). Изд. подгот. В. Г. Борухович. Л., «Наука», 1972.
3. Белецкий, А. А. Лексикология и теория языкознания. (Ономастика). (Киев). Изд-во Киевск. ун-та, 1972.
4. Билецкий, Н. В. Этические и лирические элементы в молдавской советской драматургии. Кишинев, «Штиинца», 1972.
5. Брудный, А. А. Семантика языка и психология человека. О соотношении языка, сознания и действительности. Фрунзе, «Илим», 1972.
6. Вацуро, В. Э. и Гиллельсон, М. И. Сквозь «умственные плотины». Из истории книги и прессы пушкинской поры. М., «Книга», 1972.
7. Голенищев - Кутузов, И. Н. Средневековая латинская литература Италии. М., «Наука», 1972.
8. Лавлинский, Л. Л. Сердца взрывная сила. (О лирич. поэзии 60-х гг.) М., «Сов. писатель», 1972.
9. Преподавание иностранных языков и его лингвистические основы. Сборник статей. М., «Наука», 1972.
10. Тихонов, Н. С. Писатель и эпоха. Выступления, лит. записи, очерки. М., «Сов. писатель», 1972.

# СУСТРЭЧЫ ЯШЧЭ БУДУЦЬ

Усе, напэўна, ведаюць, што ўяўляе сабой «Спадарожнік» — бюро маладзёжнага міжнароднага турызму. Працуюць у ім, у асноўным, студэнты. На нашым факультэце — гэта ўжо амаль традыцыя.

Часам чуеш: цяжка ўсё ж трэсціся па некалькі дзён у вагонах цягнікоў, аглядваць па некалькі разоў адны і тыя ж гарады ў спёку або, наадварот, у мароз? Так, часам і цяжка, але, перш за ўсё, цікава. А мітусня на вакзалах і перастук калёс, сустрэчы, развітанні становяцца тым, аб чым проста сумуеш тут, у Мінску.

Праца з групай пачынаецца з вакзала пагранічнага горада Чопа, з сустрэчы... Для перакладчыка, тым больш пачынаючага, гэта самы хвалюючы і нават самы адказны момант. Першыя словы прывітання, першыя ўсмешкі, і ты ўжо пачынаеш жыць разам з імі, думаць, як цікавей правесці заўтрашні дзень, усе наступныя дні, і думаць ужо стараешся не на рускай мове.

Маршруты бываюць розныя: у час адных пабываеш у некалькіх рэспубліках, у час другіх—у адным горадзе. І кожная група мае сваю спецыфіку: адна прыбыла з чыста турысцкімі мэтамі, сабраная па аб'яве ў газеце, другая прыехала па накіраванню прадпрыемства. А калі ў цябе 27 піянерскіх работнікаў з ЧССР, дырэктараў дамоў і палацаў піянераў, школ, настаўнікі, піянерважатыя, то праца перакладчыка набывае асаблівую цяжкасць і адказнасць.

10 дзён у Маскве: выезды ў раёны Маскоўскай вобласці, старажытны Загорск і толькі што народжаны пасёлак саўгаса «Маскоўскі» ў Ленінскім раёне, дамы і палацы піянераў, школы, музеі і сустрэчы, сустрэчы... З піянерамі, піянерскімі работнікамі. Яны ўсе цікавыя. Хіба можаш заставацца раўнадушным, калі бачыш, як сівы дырэктар Дома піянераў і маладая піянерважатая з аднолькавай увагай, захапленнем слухаюць нашых піянераў. Са слязамі на вачах услухоўваліся яны ў прыглушаны часам голас дыктара Левітана, усхваляваны расказ аб піянерах-героях у музеі школы г. Хацькова Маскоўскай вобласці. І там жа кіраўнік групы, старшыня піянерскай арганізацыі Сярэдне-Чэшскай вобласці Ірына Станькова, сказала: «Радасна бачыць такую шчырую добразычлівасць вашых дзяцей...».

Мы бачылі жаданне гасцей пераняць веды, вопыт работы піянерскіх арганізацый у нашай краіне, падзяліцца сваімі ведамі, вопытам.

А сустрэчы ўсюды былі шумныя, поўныя добразычлівасці, шчырасці сяброўскіх пачуццяў. Прыўзняты настрой, выкліканы падрыхтоўкай да 50-гадовага юбілею нашай краіны, ствараў асаблівыя ўмовы для знаёмства.

Гасцінныя гаспадары пастараліся прадставіць сябрам метадычныя распрацоўкі і даць сяброўскую параду.

А потым зноў вакзал, сум развітання... Хаваецца за паваротам апошні вагон, але хочацца верыць, што сустрэчы яшчэ будуць.

**С. ЕЛІЗАРАВА,**
**студэнтка філфака.**

# ПРЫЕМНАГА АПЕТЫТУ!

**...Спрытныя рукі завіхаюцца каля вялізнага посуду са стравамі. Нейкае імгненне і—калі ласка!—біфштэкс, плоў, беляшы... Толькі паспявае падаваць Наташа Савановіч, повар універсітэцкага буфета, што ў галоўным корпусе, і робіць гэта з гасціннай усмешкай. Хоць і працуе тут дзяўчына нядаўна—другі год, а ўжо заваявала павагу ў калектыве, дзе працуе, і сімпатыі наведвальнікаў.**

**— Вырашыла стаць поварам, таму што хацелася рабіць людзям нешта прыемнае, — расказвае Наташа. — Скончыла Мінскае прафтэхвучылішча кулінараў. У час практыкі працавала ў розных сталовых, а ў гэтай—ужо самастойна: гатую стравы або занята на раздачы. Кожны бок працы па-свойму цікавы. Гатаваць, безумоўна, больш складана і цяжка, таму і цікавей. Але праца на раздачы — гэта непасрэдныя сустрэчы з людзьмі, без якіх я таксама не ўяўляю сваёй прафесіі.**

**Як і ў любым калектыве, у работнікаў сталовай здараецца ўсялякае. Бываюць непаладкі, бываюць памылкі, але стараюцца яны ўсё рабіць так, каб ежа была высакаякаснай і смачнай. Гэты ж клопат і ў Наташы Савановіч.**

**— Цяпер, зімой, калі стала менш гародніны і фруктаў, цяжэй прыгатаваць ежу, багатую вітамінамі. Тут ужо даводзіцца кампанаваць прадукты так, каб страва была пажыўнай і падабалася наведвальнікам.**

**Ім у новым годзе мае самыя шчырыя пажаданні: вялікіх творчых поспехаў, моцнага здароўя і, безумоўна, прыемнага апетыту! А тут ужо многае залежыць ад нас, работнікаў сталовай.**

**С. ХОРСУН.**



*НА ЗДЫМКУ: Наташа Савановіч.*

Фота *Д. Чаховіча.*

# СЯБРОЎ ЗАЎСЁДЫ ЧАКАЮЦЬ

Не-не, ды і прыпомніцца нашым студэнтам лета і, канешне, другая змена спартыўна-аздараўленчага лагера Калінінградскага універсітэта «Жамчужына Балтыкі». Сустрэлі тады мінчан прыветлівае мора ля пасёлка Янтарны і сардэчнасць гаспадароў.

Не менш гасцінна прымаў калінінградцаў і наш лагер на возеры Нарач. Можна сказаць, што з абменам пуцёвак яшчэ больш узмацніліся сяброўскія адносіны нашага і Калінінградскага універсітэтаў.

Наташа Сакалова, студэнтка журфака, гаворыць:

— Хіба можна забыць жнівень! Кастры, палаткі сяброў з Масквы, Ленінграда. Цудоўныя экскурсіі па Калінінграду, Палангзе і падарункі мора—янтар. А хто ні разу не бачыў прыбалтыйскіх навальніц, той многае страціў.

Палатачны гарадок у Янтарным можна было б з упэўненасцю назваць горадам. Тут была і вуліца Мінская, вуліца Маскоўская, праспект Ленінградскі. Палюбілася і песня студэнта КДУ Ігара Красоўскага «А ў нас у Калінінградзе ўсё ў парадку». Многія павезлі яе дамоў...

Адзін з кастрычніцкіх вечароў. Напэўна, многіх зацікавіла вялікая група вясёлых студэнтаў з кветкамі на пероне Мінскага вакзала. Яны сустракалі сваіх сяброў з Калінінграда. А на наступны дзень актавая зала універсітэта ледзь змясціла жадаючых пачуць востры студэнцкі жарт Калінінградскага тэатра эстрадных мініяцюр.

Экскурсіі, арганізаваныя прафкомам БДУ, на Курган Славы і ў Хатынь пазнаёмілі нашых сяброў з памятнымі месцамі.

А затым у Калінінградзе сустракалі пасланцоў БДУ. Студэнты прыйшлі на канцэрт адразу з лекцый.

За кулісамі апошнія прыгатаванні. Нашы рабяты стараюцца зручней размясціць інструменты. Вядучыя Марына Багрый-Шахматава і Леанід Нарэйка паўтараюць тэкст. Валодзя Грэўцаў выбірае зручнейшую пазіцыю для здымкі. Усе вельмі хвалюцца. Хутчэй бы ўжо... Нарэшце, падымаецца заслона, загучала серабрыстымі пералівамі музыка Алега Янчанкі. Шум у зале зусім сціх. Затаіўшы дыханне, мы слухаем пералівы цымбал, россыпы мелодыі баяна, якія падпарадкоўваюцца лёгкім рухам дырыжорскай палачкі кіраўніка народнага аркестра народных інструментаў М. А. Лісіцына.

Віхрам па сцэне пранёсся «Гапак» нашага «Крыжачка». Гледачы доўга не адпускалі са сцэны танцораў, прасілі паўтарыць то малдаўскі танец, то рускую плясавую.

А ранкам наступнага дня Ірына Дурагіна і Алег Жывага — студэнты-калінінградцы павялі нас па вядомаму калінінградскаму заапарку, паказалі славутасці свайго горада: шматпавярховыя дамы новых светлых мікрараёнаў, рэканструіраваны цэнтр, помнікі мінулага...

Правесці нас прыйшло многа новых і добрых сяброў.

**Е. ХОЛУПАВА,**
**Е. СІНЬКЕВІЧ.**
(Карпункт прафкома БДУ).

# З ДЗЁННІКА ДЗЯЖУРНАГА ПА ФАКУЛЬТЭТУ

*СТУДЭНЦКІЯ ЎСМЕШКІ*

6/XII.72 г. За час дзяжурства нічога асаблівага не адбылося, калі не лічыць, што некаторыя студэнткі з'явіліся на заняткі ў адзенні, прызначаным для сельскагаспадарчых работ. У 15 г. 23 мін. на тэрыторыі факультэта з'явіўся невядомы мужчына, які спрабаваў курыць у недазволеным месцы. Пасля заўвагі дзяжурных невядомы знік.

7.XII.72 г. За час дзяжурства здарэнняў не было.

З пабочных асоб былі:

а) жанчына ў клятчатым паліто спытала, дзе дэканат, але пайшла ў процілеглы бок;

б) міліцыянер (аказаўся юрыстам-завочнікам) пераблытаў паверхі.

11/XII. 72 г. За час дзяжурства ніякіх сур'ёзных парушэнняў не было. Праўда, на паверх падняліся некалькі дзяўчат, якія нас горда ігнаравалі. Некаторыя з іх чыталі газету «Журналіст» і выказвалі спачуванне нашай камандзе КВЗ. Іншыя—проста прайшліся міма з незалежным выглядам. Усё гэта наводзіць на пэўныя разважанні.

На апошняй «пары» зноў на паверх прыбыла нейкая дзяўчына ў верхнім адзенні. На заўвагу, што ў верхнім адзенні хадзіць па факультэту забараняецца, яна павяла плячыма і аб'явіла нам падзяку за інфармацыю. І гэта зноў навяло нас на пэўныя разважанні.

Сярод пяцікурснікаў назіралася масавае «бадзянне» па паверху.

Гэта зноў навяло нас на пэўныя разважанні.

25/XII. 72 г. За час дзяжурства асаблівых парушэнняў не было. На пажарным кране № 12 было разбіта шкло. Злачынцу ўдалося знікнуць.

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

Наш адрас: г. Мінск, універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106. Тэлефон — 22-07-19.
Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 06503
Тыраж 2.000 экз. Заказ 04